**УМОВЫ**
**правядзення конкурса**
**“ЛЕТА І КНІГА – 2019”**

1. Конкурс “Лета і кніга – 2019” (далей – Конкурс) праводзіцца дзіцячым філіялам ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

2. Асноўная мэта Конкурсу – прыцягненне дзяцей да чытання ў летні перыяд, уключэнне іх у творчую дзейнасць; арганізацыя вольнага часу.

3. Конкурс праводзіцца ў перыяд з 1 чэрвеня па 30 жніўня 2019 года.

4. У Конкурсе прымаюць удзел навучэнцы агульнаадукацыйных школ г. Гродна, дашкольнікі і іх бацькі.

5. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

- “Лепшы чытач” *(хто прачытае найбольшую колькасць кніг)*;
- “Самы юны чытач”;
- “Юны эрудыт”;
- “Чытаючая сям'я”;
- “Аматары беларускай літаратуры”.

6. У межах Конкурса неабходна:

- прачытаць у перыяд летніх канікул не менш 20-ці кніг;
- падрыхтаваць творчую працу па прачытаных кнігах (верш, водгук, сачыненне, фотаздымак, малюнак, выраб і г.д.).

7. Творчыя працы могуць быць выкананы як на беларускай, так і на рускай мовах.

8. Працы прымаюцца да 1 верасня 2019 года па адрасе: вул. Савецкая, 25, дзіцячы філіял ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага” і павінны змяшчаць наступную інфармацыю:

- назва;
- прозвішча, імя ўдзельніка;
- поўная назва навучальнай установы;
- адрас, кантактны тэлефон.

9. Працы, якія паступілі пазней названай даты, разглядацца не будуць.

10. Вынікі Конкурсу падводзяцца на пасяджэнні журы (Дадатак 1) да 5 верасня 2019 года.

11. Па выніках Конкурсу журы вызначае па 3 пераможцы ў кожнай намінацыі.

12. Журы пакідае за сабой права не прысуджаць узнагароды

пры адсутнасці ўдзельнікаў, а таксама калі творчыя працы падрыхтаваны не ў поўнай меры.

13. Пераможцы Конкурса ў кожнай намінацыі ўзнагароджваюцца дыпломамі.

14. Узнагароджанне пераможцаў Конкурса адбудзецца ў верасні 2019 года падчас III фестывалю кнігі “Кніжныя скарбы Беларусі”.

15. Вынікі Конкурсу размяшчаюцца на сайце ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

**Дадатак 1**

**ЖУРЫ**
конкурса “Лета і кніга – 2019”

1. Луцэвіч Валянціна Антонаўна, загадчык дзіцячага філіяла ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, старшыня журы;

2. Пасвісцелік Ірына Паўлаўна, бібліятэкар І катэгорыі дзіцячага філіяла ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, сакратар журы;

3. Кашлей Рэгінна Іосіфаўна, бібліятэкар І катэгорыі дзіцячага філіяла ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

4. Салей Жана Мікалаеўна, бібліятэкар І катэгорыі дзіцячага філіяла ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

5. Сянчыла Ілона Алегаўна, галоўны бібліятэкар аддзела дзіцячага філіяла ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

6. Рамук Алена Браніславаўна, бібліятэкар дзіцячага філіяла ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

7. Юркавец Лідзія Леанідаўна, бібліятэкар ІІ катэгорыі дзіцячага філіяла ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.